УДК 008:811.163(476)«1920»

**І. У. Каляда**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (БДТУ)

# «КАРЭНІЗАЦЫЯ» ДЗЯРЖАЎНАГА АПАРАТУ БССР ЯК АДЗІН З НАКІРУНКАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў 1920-Я ГГ.

Публікацыя прысвечана пытанню правядзення «карэнізацыі» – складовай часткі нацыянальнай палітыкі БССР 1920-х гг. Разглядаюцца прычыны, якія вызначылі гэты накірунак, яго змест і вынікі ажыццяўлення. Асабліва вылучаецца тое, што названая палітыка была абумоўлена непрапарцыйна нізкай доляй беларусаў – прадстаўнікоў карэннай нацыі – у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання.

The article deals with guestion of the part of the national policy of the BSSR in 1920 – korenizatsiya. The article discusses the reasons which determined the direction, its content and results. Much attention is paid to the fact that this policy was due to a disproportionatelylow share of Belarusian people – representatives of fundamental nation in the party, sovets, economic authorities and government.

**Уводзіны.** У гісторыю Беларусі 1920-я гг. увайшлі як перыяд адраджэння, росквіту беларускай культуры і мовы. Але найбольш цікавай, можна сказаць, унікальнай з’явай гэтага часу была беларусізацыя, праграма якой уключала перавод на беларускую мову справаводства партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага і кааператыўнага апаратаў, вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу (карэнізацыя), арганізацыю школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў з выкладаннем на беларускай мове, развіццё беларускай літаратуры, навукова-даследчай працы па ўсебаковым вывучэнні Беларусі, пашырэнне беларускага друку і інш.

За адраджэнне сваёй мовы і культуры ўзяліся як беларуская інтэлігенцыя, так і кіраўнікі рэспублікі, усе шчырыя сябры роднага краю. Мова народа стала дзяржаўнай не ў дэкларацыях, а ў самім жыцці.

**Асноўная частка.** Безумоўна, усталяванне трывалай нацыянальнай самасвядомасці – адна з галоўных умоў адраджэння нацыі. Нацыянальная самасвядомасць, з аднаго боку, з’яўляецца адлюстраваннем аб’ектыўна існуючых прыкмет кожнай нацыі, у т. л. культуры, мовы, а з другога – сама здольная актыўна ўплываць на іх падтрымку, стымуляваць кансалідацыю нацыі, арыентаваць людзей на дасягненне поспехаў усёй нацыі, ажыццяўленне нацыянальных інтарэсаў.

Для сённяшняга беларускага грамадства жыццёва неабходна ўсталяванне трывалай нацыянальнай самасвядомасці. Галоўная ж прычына, якая замаруджвае працэс, – гэта памылковасць поглядаў, непаважлівыя адносіны многіх беларусаў да сваіх гістарычных, нацыянальных традыцый, да ўласнага будучага.

Афіцыйны статус дзяржаўнай палітыкі беларусізацыя атрымала з прыняццем на II сесіі ЦВК БССР (ліпень 1924 г.) пастановы «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі» [1] і рэзалюцыі пленума ЦК КП(б)Б (ліпень 1924 г.) «Аб праграме работ па правядзенні нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі». З гэтага часу праграма беларусізацыі набыла сілу закона. Адным з пунктаў гэтых пастаноў быў той, што непасрэдна тычыўся карэнізацыі: вылучэнне беларусаў на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу.

Беларусізацыя адначасова з’яўлялася як партыйнай, так і дзяржаўнай палітыкай.

Яе арганізацыйная структура была закладзена менавіта ў сістэме дзяржаўных органаў БССР. Дзяржаўны апарат, з аднаго боку, фарміраваў асноўныя кірункі гэтай палітыкі, а з другога – з’яўляўся адным з аб’ектаў яе ўвасаблення. Пасля таго, як беларусізацыя была аб’яўлена дзяржаўнай палітыкай, шэраг важных мерапрыемстваў у гэтым накірунку ажыццяўлялі рэспубліканскія і акруговыя партыйныя органы, апарат наркаматаў і ведамстваў.

Рэалізацыя палітыкі беларусізацыі ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва і аптымізацыя работы сістэмы дзяржаўных устаноў звадзілася да трох асноўных накірункаў: авалоданне беларускай мовай супрацоўнікамі дзяржаўных устаноў, перавод на беларускую мову ўсёй сістэмы справаводства і вылучэнне на кіруючыя пасады беларусаў.

Не прапарцыйна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання па-свойму ўскладняла выпрацоўку і правядзенне нацыянальнай палітыкі. Беларусізацыя пачыналася тады, калі гэтая доля не дасягала і паловы. Напрыклад, у партыйных органах, якія вызначалі палітыку на ўсіх узроўнях, суадносіны былі такія: з 13 членаў ЦБ КП(б)Б у 1922 г. беларусаў было 5, яўрэяў – 6, іншых – 2; з 74 членаў павятовых камітэтаў партыі – 31 (41,8%) былі беларусы, 34 (45,9%) – яўрэі, 9 (12,1%) – іншыя нацыянальнасці.

Не лепшае становішча назіралася і ў дзяржаўных органах. Так, з 50 членаў ЦВК БССР III склікання (снежань 1921 г.) беларусаў было 19 (38%), яўрэяў – 17 (34%), рускіх – 3 (6%), украінцаў – 1 (2%), палякаў – 6 (12%), літоўцаў – 2 (4%), латышоў – 2 (4%). Толькі ў павятовых і сельскіх Саветах пераважалі беларусы. На 1.08.1922 г. са 101 члена павятовых выканкамаў беларусаў было 77 (76,2%), рускіх – 5 (4,9%), яўрэяў –18 (17,8%), іншых – 4 (3,9%) [2].

Як бачым, назіралася такая з'ява, калі беларусы – большасць насельніцтва рэспублікі – засталіся ў відавочнай меншасці ў партыйным і дзяржаўным апараце. Зразумела, што падобнае становішча не садзейнічала нармальнаму развіццю нацыянальных адносін і мела ў далейшым самыя негатыўныя вынікі.

Такія суадносіны ў кіруючых органах тлумачацца ў першую чаргу тым, што яўрэі і рускія, якія пражывалі ў асноўным у гарадах і мястэчках, нават і да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. мелі больш магчымасцей атрымліваць добрую адукацыю. Невыпадкова, паводле перапісу 1926 г., самая значная колькасць пісьменных сярод розных нацыянальнасцей на Беларусі была ў яўрэяў – 70%, трохі менш у палякаў і рускіх – 50 і 49 адпаведна, у беларусаў – 36% [3].

Пры распрацоўцы палітыкі беларусізацыі на кадравае пытанне была звернута асаблівая ўвага. Вядома, ніхто не збіраўся гвалтоўна змяняць нацыянальны склад вышэйшых партыйных і савецкіх органаў. Аднак, як будзе паказана далей, да 1928–1929 гг. у гэтым складзе адбудуцца істотныя змены.

На працягу 1924–1925 гг. распрацоўка праграмы беларусізацыі ў цэлым была завершана. Гэта палітыка складалася з дзвюх узаемазалежных частак: нацыяналізацыі і карэнізацыі.

Першая азначала шырокае развіццё беларускай культуры (школы, ВНУ на беларускай мове, выданне кніг, навукова-даследчая работа па ўсебаковым вывучэнні Беларусі і г. д.), увядзенне беларускай мовы практычна ў кожную галіну грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця (перавод на беларускую мову партыйнага, дзяржаўнага, прафесійнага, кааператыўнага апаратаў і часцей Чырвонай арміі). А другая – вылучэнне прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу. Прычым такое вылучэнне адбывалася не па нацыянальнай прыкмеце (беларус не беларус), а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканалым валоданні беларускай і рускай мовамі. Адсюль і назва гэтага накірунку – карэнізацыя, якая датычылася не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Карэнізацыя, якая стала адным з цэнтральных накірункаў беларусізацыі, прадугледжвала фарміраванне ў рэспубліцы кіруючага звяна з прадстаўнікоў усіх мясцовых карэнных нацыянальнасцей. Гэта палажэнне было адзначана ў рэзалюцыі студзеньскага пленума ЦК КП(б)Б, у справаздачах X з'езда КП(б)Б, а таксама ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б «Аб нацыянальным складзе партыйных, прафесійных, савецкіх і іншых органаў», прынятай 27 жніўня 1927 г. Тут падкрэслівалася, што вылучэнне беларусаў на адказную работу і ў далейшым застаецца галоўнай задачай у справе нацыяналізацыі партыйных, прафесійных, савецкіх і іншых устаноў. Пры фарміраванні кіруючых кадраў прапаноўвалася ўлічваць у першую чаргу палітычную вытрыманасць вылучэнцаў, іх дзелавыя якасці, веданне беларускай мовы і ўмоў развіцця БССР. Пастанова прадпісвала павялічыць колькасць беларусаў у партыйных, прафсаюзных, мясцовых савецкіх органах, у складзе калегій наркаматаў, кіраванняў банкаў, маскоўскіх прадстаўніцтваў БССР і інш.

Карэнізацыя – гэта, акрамя таго, і найбольш складанае пытанне беларусізацыі, бо менавіта тут лягчэй за ўсё маглі ўзнікнуць узаемныя крыўды, непаразуменні на глебе супрацьстаўлення інтарэсаў адной нацыянальнасці другой. Аднак і вырашаць яго трэба было неадкладна. Доля беларусаў у органах улады і кіравання была зусім невялікая адносна агульнай удзельнай вагі ў складзе насельніцтва. Такое становішча неабходна было мяняць, што з ростам адукаванасці і культурнага ўзроўню ўсё вастрэй усведамлялася шырокімі слаямі насельніцтва.

Тым не менш яшчэ ў пачатку 1920-х гг. пры распрацоўцы нацыянальнай палітыкі ставілася задача вылучэння прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на тую ці іншую пасаду не па нацыянальнасці, а паводле дзелавых якасцей, ведання беларускай і рускай мовы, гісторыі Беларусі і г. д. У рэзалюцыі студзеньскага (1925 г.) пленума ЦК КП(б)Б спецыяльна агаворвалася: «Ставячы працу па вылучэнні беларускіх таварышаў, тым не менш не процістаўляць іх ніколі тым супрацоўнікам, не беларусам, якія вывучылі беларускую мову і мясцовыя ўмовы» [4]. Тым не менш карэнізацыя балюча ўспрымалася некаторай часткай інтэлігенцыі нацыянальных меншасцей, якая бачыла ў гэтай справе толькі выдзяленне беларусаў.

У 1924–1925 гг. у апараце цэнтральных органаў улады працэнт яўрэяў, рускіх і іншых у адносінах да беларускага насельніцтва з'яўляўся даволі такі значным і нават пераваж-

ным. Тлумачыцца гэта тым, што прадстаўнікі гэтых нацыянальнасцей жылі большай часткай у гарадах, а цэнтральныя апараты насычаліся, галоўным чынам, за кошт гарадскога насельніцтва. У мясцовых жа апаратах працэнт беларусаў з'яўляўся пераважным у адносінах да іншых нацыянальнасцей.

1926–1927 гг. сталі часам найбольш актыўнага ажыццяўлення мерапрыемстваў па беларусізацыі дзяржапарата і найбольш руплівай праверкі гэтай работы. Менавіта тады былі прыняты пастановы аб вылучэнні ў партыйныя, савецкія, прафесійныя і гаспадарчыя органы работнікаў з мясцовага насельніцтва, аб праверцы выканання мерапрыемстваў па беларусізацыі дзяржаўных устаноў рэспублікі, аб дзейнасці нацыянальных Саветаў і інш. У справаздачах і паведамленнях, што дасылаліся ў Нацкамісію пры ЦВК БССР, у пратаколах праверачных камісій сталі з'яўляцца лічбы, якія сведчылі пра пэўныях поспехі.

У 1927 г. пастанова Бюро ЦК КП(б)Б «Агульныя вывады па праверцы беларусізацыі дзяржаўных устаноў БССР» адзначала «ў гэты момант … увогуле здавальняючае становішча ў справе беларусізацыі нашых дзяржаўных устаноў» [5].

У 1929 г. у выніку правядзення карэнізацыі становішча было такое: доля беларусаў у адміністрацыйных установах складала 51,3%, рускіх – 18, яўрэяў – 24,8, палякаў – 0,1, іншых – 5,8%. У цэнтральным савецкім апараце доля беларусаў складала 32,5%, рускіх – 24,2, яўрэяў – 36,8%. У гаспадарчых установах доля беларусаў раўнялася 30,8%, рускіх – 13,1, яўрэяў – 49,3, палякаў – 1,1, іншых – 5,7%. Напрыклад, у апараце Вышэйшага Савета Народнай Гаспадаркі Беларусі сярод спецыялістаў-інжынераў беларусы складалі 26%, рускія – 12,2, яўрэі – 52, палякі – 1,6, іншыя – 3,1%. У судовых установах беларусаў налічвалася 26,3%, рускіх – 21,1, яўрэяў – 42,2, іншых – 11,5%; у зямельных органах беларусаў было 59,5%, рускіх – 24,1, яўрэяў – 10,1, іншых – 6,3% [6].

Такім чынам, пераважны працэнт беларусаў назіраўся ў адміністрацыйных і зямельных органах, у гаспадарчых і судовых большасць складалі яўрэі, што тлумачыцца гістарычным мінулым, большым культурным узроўнем, большай падрыхтоўкай іх у галіне спецыяльных ведаў: юрыдычных, эканамічных, гаспадарчых.

У канцы 1920-х гг. у рэспубліцы стаў прыкметным паступовы адыход ад першапачатковага разуменння беларусізацыі. Гэта было звязана з фарміраваннем і ўзмацненнем у краіне таталітарнай адміністрацыйна-каманднай сістэмы, калі набіраў сілу дагматызм, у духоўным жыцці зацвярджаліся забароны, нацыянальнае ўсё часцей стала свядома атаясамлівацца з нацыяналістычным.

Адступленне ад прынцыпаў беларусізацыі знайшло адлюстраванне ў скарачэнні колькасці беларусаў у кіруючых органах, пераводзе дзейнасці школ, культурна-асветніцкіх устаноў з беларускай на рускую мову, змяншэнні тыражоў беларускамоўных выданняў і г. д. Пачалося адкрытае наступленне на нацыянальную інтэлігенцыю, якую ўсё часцей сталі абвінавачваць у прыхільнасці да «нацыянал-дэмакратызму», у імкненні «нацыянальныя інтарэсы ставіць вышэй за класавыя».

**Заключэнне.** У заключэнні хацелася б падкрэсліць тое, што нацыянальная самасвядомасць фарміруецца пад уплывам аб'ектыўных фактараў, што робіць надзвычай актуальным мэтанакіраваны ўплыў на яе, а гэта, у сваю чаргу, спрыяе давядзенню самасвядомасці да ўзроўню, які забяспечваў бы поўную гарантыю ад культурнай асіміляцыі, знікнення як самастойнай нацыі. Асабліва важным тут з'яўляецца ўмелае выкарыстанне тых гістарычных традыцый і духоўных каштоўнасцей, якія назапашаны папярэднімі пакаленнямі, свядомае вяртанне народа да гістарычных каранёў, нацыянальных традыцый.

## Літаратура

1. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР: у 2 ч. – Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1928. – Ч. 1: Беларусізацыя. – 152 с.

2. Беларусізацыя: 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад агул. рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 57.

3. Альшэўская, С. І. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі (1917–1927 гг.) / С. І. Альшэўская, В. Ф. Касовіч, Л. А. Шульга. – Мінск: БДУ, 2000. – 69 с.

4. Рэзалюцыя пленума ЦК КП(б)Б, 25–29 студзеня 1925 г. // Беларусізацыя: 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад агул. рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 58–69.

5. Агульныя вывады па праверцы беларусізацыі дзяржаўных устаноў БССР: пастанова Бюро ЦК КП(б)Б ад 1 красавіка 1927 г. // Беларусізацыя: 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад агул. рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001. С. 175–178.

6. Беларусізацыя: 1920-я гады: дакументы і матэрыялы / пад агул. рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 214.

*Паступіла 30.03.2011*